**УДК 39:94 (476-22) (091)**

# ПАСЛЯВАЕННАЕ ДЗЯЦІНСТВА: ПРАЦА, АДУКАЦЫЯ І ВОЛЬНЫ ЧАС (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ ПОЛАЧЧЫНЫ)[1]

***канд. гіст. навук, дац. А.В. СУМКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-9940-0236***

*Аналізуюцца асноўныя сюжэты, якія раскрываюць асаблівасці пасляваеннага дзяцінства вясковых дзяцей Паўночнай Беларусі. У якасці крыніц даследавання выступаюць уласныя запісы аўтара, а таксама матэрыялы этнаграфічных экспедыцый Полацкага дяржаўнага ўніверсітэта[2]. Палявыя даследаванні фіксуюць, што роля і месца дзецей у сістэме жыццезабеспячэння сялянскай сям'і, магчымасць вучыцца і распраджацца сваім вольным часам цалкам залежалі ад складу і эканамічнага дабрабыту сям'і, а таксама ад сістэмы жыццёвых каштоўнасцей, якія трансліраваліся сям'ёй рэспандэнта. Не апошнюю ролю адыгрывала занальная спецыфіка рэгіёна (заходнія і ўсходнія раёны, якія прадстаўлялі дзве мадэлі сістэмы жыццезабеспячэння ў пасляваенны перыяд), прадвызначыўшая пэўныя адрозненні ў дзіцячай паўсядзённасці Полаччыны.*

***Ключавыя словы:*** *пасляваеннае аднаўленне, вёска, сістэма жыццезабеспячэння, дзяцінства, праца, адукацыя, школа, гульні.*

**Уводзіны.** У апошні час актуалізуеца інтарэс да даследавання паўсядзённасці дзяцінства. Прычым ён рэалізуецца ў розных прадметных плоскасцях: гісторыя, антрапалогія, псіхалогія і г.д. і найбольш поўна прадстаўлены ў расійскай і замежнай гістарыяграфіі. Вывучэнне паўсядзённага жыцця дзяцей дазваляе разглядзець гістарычную рэальнасць з пункту гледжання пэўнай катэгорыі насельніцтва. Асноўнай крыніцай з'яўляюцца непасрэдна ўспаміны людзей, дзяцінства якіх прыпала на ваенныя і пасляваенныя гады, аналіз якіх дапамагае скласці тагачасную карціну свету, зразумець як разнастайныя жыццёвыя сітуацыі паўплывалі на развіццё канкрэтнай асобы, а таксама наколькі індывідуальны наратыў пра ўласнае дзяцінства адпавядае дзяцінству канкрэтнай сацыяльнай групы ці абранай эпохі.

Даследчыкі вылучаюць асаблівае пакаленне дзяцей вайны, чыё дзяцінства прыпала на гады ваеннага ліхалецця і цяжкі перыяд пасляваенага аднаўлення. Неабходна адзначыць, што і самі рэспандэнты падчас размовы адзначаюць пэўную еднасць свайго пакалення: "*...во мы дзеці, але ж **мы, дзеці вайны**, усе дружныя. У школе, вот пераменка, бяжым, ага, а давайце к вам бліжэй, паглядзім што ў печы варына. А што там варына? Ужо калі карова была, так суп бялёны. Усё, дастаём кацялочак, садзімся. А на другой – к другім. А сейчас...*" (Ушацкі р-н)[3]. Пасляваенная паўсядзённасць мела сваю спецыфіку і адрознівалася ад штодзённасці мірнага часу. Гэта адбілася і на побыце дзяцей, якія вымушаны былі адаптавацца да складаных умоў і вельмі хутка пасталець. Неспрыяльнае эканамічнае становішча і спецыфічная пасляваенная дэмаграфічная сітуацыя прывялі да таго, што нагрузка на дзецей у паваенныя гады ў сістэме жыццезабеспячэння беларускай вёскі значна ўзрасла, што, у сваю чаргу, скарэктавала баўленне вольнага часу і адмоўным чынам паўплывала на магчымасці атрымаць ці працягнуць адукацыю.

Спецыфіка пасляваеннага дзяцінства прадметна не разглядалася айчыннымі даследчыкамі. Асобныя сюжэты раскрываліся пры асвятленні традыцый сямейнага выхавання [1], гісторыі і класіфікацыі традыцыйных гульняў [2] ці ў межах вывучэння пасляваеннай рэчаіснасці. Некаторыя аспекты існавання дзяцей ва ўмовах надзвычайнага ваеннага часу пасля вызвалення ад нацыстаў прыводзіць у сваіх артыкулах І. Нікалаева [3; 4]. Даследаванне ажыццяўлялася на падставе архіўных матэрыялаў, якія датычыліся тэрыторыі Віцебскай вобласці, і дазваляе зрабіць высновы пра рэгіянальныя сацыяльна-эканамічныя абставіны, у якіх апынуліся тагачасныя дзеці і іх бацькі.

Геаграфія даследавання – тэрыторыя Полацкай вобласці, якая існавала з 1944 па 1954 год і ўключала наступныя раёны: Ветрынскі, Дрысенскі, Асвейскі, Полацкі, Расонскі, Ушацкі раёны (так званыя *ўсходнія*); Браслаўскі, Відзаўскі, Глыбоцкі, Дзісненскі, Докшыцкі, Дунілавіцкі, Міёрскі, Плiскі, Шаркаўшчынскі раёны (*заходнія раёны*, якія да 1939 г. уваходзілі ў склад Польшчы). Пад тэрмінам "Полаччына" маецца на ўвазе тэрыторыя былой Полацкай вобласці, альбо заходняя і часткова цэнтральная часткі сучаснай Віцебшчыны.

Даследаванне пасляваеннай дзіцячай паўсядзённасці на прыкладзе пэўнага рэгіёну дае магчымасць не толькі вызначыць характэрныя рысы азначанага феномена, але і ўдакладніць ролю дзяцей у сістэме жыццезабеспячэння тагачаснай вясковай сям'і, што з'ўляецца складовай часткай асобнай даследчай тэмы – культуры жыццезабеспячэння беларускай вёскі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД – РФФД "Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья XX – начала XXI века", дамова № Г20Р-095.

[2] З мэтай захавання прыватнасці асабістых даных прыводзяцца толькі ініцыялы рэспандэнтаў і пазначаецца пол: Ж – жанчына, М – мужчына. Запісы захоўваюцца ў Цэнтры вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФА ПДУ), а таксама ў асабістым архіве аўтара.

[3] ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. Лобач У., Сумко А. ад СВМ (Ж)., 1933 г.н., в. Мажуйкі, Ушацкі р-н.

**Асноўная частка.** Згодна з Л.В. Ракавай, у адпаведнасці з традыцыямі і народнымі поглядамі існавалі наступныя ўзроставыя ступені дзяцінства: *маленства* – ад нараджэння да 6–8 гадоў; *дзяцінства* – ад 6–8 да 12–14 гадоў; *падлеткавы ўзрост* – ад 12–14 да 16–17 гадоў і *юнацтва* – ад 16–17 да 18 – 20 гадоў [1, с. 10]. Дадзеныя этапы досыць умоўна гучаць ва ўспамінах рэспандэнтаў, асабліва, калі размова вядзецца пра пераходны перыяд: "*Гэта ўсягда…ужо падрастаеш, падходіць гэта, як сказаць, у яго па-другому кроўка начынаець і ўжо ня хочацца з рабятамі бегаць, і тут не бяруць*" (Міёрскі р-н)[4]. Вельмі красамоўна пра ўзроставыя ступені адзначыў адзін з рэспандэнтаў "*Маё детства малое прайшло: да пятнаццаці лет вайна, а тут у мяне ўжо пашла ўзрослая жызнь, з пятнаццаці…*" (Верхнядзвінскі р-н)[5]. Увогуле адлюстраванне пасляваенных рэалій у індывідуальнай памяці мае свае асаблівасці. Для іх характэрна кампрэсія гістарычнага часу і адносная храналогія, калі храналагічнымі маркерамі выступаюць не канкрэтныя даты, а пэўныя ключавыя моманты, якія падзяляюць жыццё чалавека на "да" і "пасля". Матэрыялы вуснай гісторыі Полаччыны фіксуюць наступныя найбольш распаўсюджаныя сюжэты, звязаныя з пасляваенным дзяцінствам – дапамога бацькам і гаспадарчы клопат, адукацыя, а таксама баўленьне вольнага часу.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, пасля вызвалення ад нацыстаў амаль ва ўсіх раёнах Полацкай вобласці ў верасні 1944 г. дзеці селі за школьныя парты. Згодна з архіўнымі дакументамі ва ўсходніх раёнах Полацкай вобласці ў 1940 г. налічвалася 446 школ ( з іх 312 пачатковых), якія ахоплівалі 61 670 чалавек, за перыяд акупацыі было знішчана 365 школ. У першы год пасля вызвалення функцыянавала 365 школ (31 982 вучня), з якіх 85 размяшчалася ў спецыяльных памяшканнях, 120 – у наёмных, 31 – у землянках [5, л. 17]. Трэба адзначыць, што за гады вайны амаль поўнасцю была разбурана матэрыяльна-тэхнічная база навучальных устаноў. Палявыя матэрыялы даюць магчымасць зразумець, як праходзіла навучанне ва ўмовах недахопу элементарных рэчаў: падручнікаў, сшыткаў, ручак, алоўкаў і чарніл. Паказальным з'яўляецца фрагмент з успамінаў рэспандэнта пра тое, як вучылі пісаць тагачасных першакласнікаў: "*Садзімся на пяску, а настаўніца палачкай на пяску "А" – вот так палачку і так – на пяску выводзіць буквы. Школы ж не было! На вуліцы селі і начынаем пісаць на пяску, значыць буквы вучыць* " (былы Асвейскі раён)[6]. У якасці сшыткаў выкарыстоўвалі даступны падручны матэрыял: газеты (пісалі паміж радкоў), чарнавікі, мяшкі. "*Ні цетрадей, ні ручкі, ні пера, ні чарніла, нічога нет, а вучыцца хочацца. Так мы з мяшкоў, такія мяшкі, як вот цэмент, но немцы вазілі можа прадукты ў мяшках, харошы такі запах, можа якое пячэнне прывазілі ілі сухары якія. Мяшкі гэтыя пустыя валяліся, яны ж ў нескалька слаёў гэтая бумага і выражым з унутры, каторыя чысцінькія лісты, гладзенькія і яшчэ падгладзім уцюгом. І такія дзелалі сабе цетрадкі з гэтых мяшкоў, і на газетах нямецкіх пісалі сярод строчак.*" (Верхнядзвінскі р-н)[7]; "*На чым пісалі? Вот мама як ездзіла за хлебам, за зярнятамі ў Полацк – а там мяшкі, гэтая рудая бумага такая, што ўпакоўка. Так вот гэтую бумагу прывазіла рудую, і тады я ў школу брала, пісала. Дык мне завідвалі рабяты, што ў мяне такая бумага*" (Ушацкі р-н)[8]; "*Помню газеты палучылі, на газеты пісалі. Гэта учыцель дзе-та дастанець кусок газеты. Так што жа, мы гэтыя цыфры па мацемаціке на газетах напішам, а нам жа нада пасчытаць. Не каждый к даске пойдзець.*" (Міёрскі р-н)[9].

Рэспандэнты ўзгадвалі, што ў першыя пасляваенныя гады элементарна не хапала падручнікаў. Распаўсюджанай была сітуацыя, калі неабходны экземпляр быў толькі ў настаўніцы. У такім выпадку падручнік перадаваўся з рук у рукі пасля заняткаў у школе, каб дзеці маглі выканаць дамашняе заданне: "*Перапісвалі стіхатварэнне якое-небудь на бумагу, учым…не хватала учэбнікаў. Учыцельніцы адна кніжка, у якой дзярэўне многа рабят, тады аддасць туды гэтую кніжку, носяць з хаты ў хату, перапісваюць. Я толькі спасалася тым, што память харошая. Помню сціхатварэнне бальшое нада было вывучыць, а не была ў класе – была на пасце, пасла скот, не была ў школе ў той дзень і не знала, што нам далі заданне выўчыць сціхатварэнне. Я прыйшла ў клас, а дзевачкі, значыць, адна расказваець, а другая слядзіць па бумаге, а потым чэрэдуюцаа: гэтая буде чытаць, гэта буде слядзіць. Я сяжу і ціхонечка слушаю і я выўчыла і не хужы за гэтых дзевачак сдала сваё сціхатварэнне*" (Верхнядзвінскі р-н)[10]; "*А кніжак не было. Адна кніжка на нашу дзярэўню і на Крывыя. Дзе ж ты ўрокі вывучыш па гэтых кніжках?*" (Ушацкі р-н)[11]; "*А не было ж вучыцца на чым, помню, пойдзем у школу, учыцельніца маладая была, дзе-нібудзь якую бумажынцу, картоніну, ці што, надрукуець нам, такімі друкаваннымі буквамі напішэць і вучыла нас, вот так вучыліся*" (Глыбоцкі р-н)[12].

Адным з самых распаўсюджаных з'яўляюцца аповяды пра тое, як дзеці ў хатніх умовах займаліся саматужным вырабам чарніла. У гэтым працэсе былі задзейнічаны рэсурсы сям'і і прыродная кемлівасць. Дарэчы, гэта падцвярджаюць і архіўныя дакументы. Напрыклад, у дакладной запісцы пра школы Расонскага раёна за 46 год было пазначана: "Ручек, чернил нет. Тут проявляется только изобретательность детей. Пишут углем и отваром" [5, л. 114 – 118]. Палявыя матэрыялы сведчаць, што ў якасці чарніла выкарыстоўлі сок бурака, марганцоўку, сажу

[4] Запісана аўтарам (ЗА) у 2021 г. ад НАД (Ж), 1928 г.р., в Узмёны Міерскага р-на; файл № 1456.
[5] ЗА у 2021 г. ад ЮМА (Ж), 1930 г.н., в. Первамайскае Верхнядзвінскага р-на; файл № 1346.
[6] ЗА у 2020 г. ад ЛЕП (Ж), 1936 г.н., Асвея Верхнядзвінскага р-на; файл № 1402_01.
[7] ЗА у 2021 г. ад ВФЮ (Ж), 1931 г.н., в. Барсукі Верхнядзвінскага р-на; файл № 2212.
[8] ФА ПДУ: Зап. Лобач У.А., Сумко А.В. у 2020 г. ад ЖКС (Ж), 1931 г.н., в. Лажані Ушацкага р-на.
[9] ФА ПДУ: Зап. Сумко А., Саланевіч А., Якубенак І. у 2019 г. ад ЯЛЯ (Ж), 1931 г.н. г. Дзісна.
[10] ЗА у 2021 г. ад ВФЮ (Ж), 1931 г.н., в. Барсукі Верхнядзвінскага р-на; файл № 2212.
[11] ФА ПДУ: Зап. Лобач У.А., Сумко А.В. у 2020 г. ад ЖКС (Ж), 1931 г.н., в. Лажані Ушацкага р-на.
[12] ФА ПДУ: Зап. Лобач У.А., Сумко А.В. у 2020 г. ад ШВА (Ж), 1935 г.н., в. Празарокі Глыбоцкага р-на.

ці настой з крушыны. Вельмі падрабязна пра гэта ўзгадвае Франя Юльянаўна: “*А я із крушыны, крушынавых ягад, зварю ў кансервнай баначке, мама топіць печку, а я баначку паставіла з ягадамі, зварү гэтых ягад, патом цераз трапачку выжму сок і з гэтага соку харошыя чарніла палучаліся і бумагу не раз’ядалі*” (Верхнядзвінскі р-н)[13]. Палявыя матэрыялы сведчаць пра тое, што дзеці абменьваліся паміж сабой, каб атрымаць неабходныя рэчы для навучальнага працэсу: “*Толькі што не было ні ручкі, ні пера. Дзевачка, якая са мной сядзела, была местная, іхняя дзярэўня не была спаленая, у гэтай дзевачкі была ржавая пёрышка. І гэта дзевачка дала мне пёрышка і прывязала яго нітачкай да палачкі і такая ў мяне была ручка. Мы дзяліліся: я прынясла чарніла, а ў яе была чарнільніца і вот мы налівалі чарніла і ў класе пісалі чарнілам гэтым, а патом яна ўнасіла яе дамой і дома пісала ўрокі, а ў мяне бутылачка была*” (Верхнядзвінскі р-н)[14].

Большасць рэспандэнтаў падчас успамінаў пра сваё дзяцінства ўзгадваюць пра тое, як было складана дабірацца да школы. Гэта перш за ўсё было абумоўлена тэрытарыяльнай аддаленасцю навучальнай установы ад дома і тым, што ў пасляваеннае дзесяцігоддзе амаль палова школ працавала ў дзве змены. Асабліва праблематычна было дабірацці ў восеньска-зімовы перыяд, калі дзень быў кароткі, а дарога станавілася амаль непраходнай. “*Я уже поступила в семилетку, это я ходила из Белево, так Поташня – 2 км, а потом к Двине туда – Чурилова, это еще километров пять. Это каждый день я ходила в школу! Нас было несколько, а потом девочки побросали. И несколько ручьев надо было перейти, и дорога по полю шла. Зимою задует – не видно. Мы и палочки втаркивали, и ветки сосны лажили, чтобы идти по твердой земле. А может в классе шестом во вторую смену поставили, в Чуриловской школе, во вторую смену зимой! Это во сколько мы приходили домой?! Этих там 5-7 км надо было пройти каждый день и сделать уроки*” (Міёрскі р-н)[15]. Небяспеку прадстаўлялі і ваўкі, якіх у першыя гады пасля вызвалення было шмат. “*А ваўкі хадзілі. Неяк было дзяцям выйці”* (Ушацкі р-н)[16].

Сур'ёзнай праблемай для тагачасных дзяцей быў недахоп адзення і абутку. У сваіх успамінах рэспандэнты, асабліва з найбольш пацярпелых раёнаў Полаччыны, падкрэсліваюць, што ўзімку літаральна не было чаго абуць. “*В деревяшках хаділі…холадна было, канешне. Я іду ў школу, я ня чувствую ног, ня чувствую пальцев, замерзнуць ногі так, ну чулкі шарсцяныя былі звязаныя, но ўсё роўна холадна і вот эці баціначкі тоненькія на дзеравяннай падашве, ня чувствую ног, як на калках іду, а ў школе цёпла, я ня слышу нічога, я не магу, цяраю сазнанне, не слышу, што вучыцельніца гаворыць, мне так плоха, аж заходзіцца сердца, пака атойдуцца мае ногі – атагрэюцца, як атагрэюцца, так ужо нічога. Дамой, як ідзём, ужо харашо, пацяплееець – ужо солнышка. Днём жа цяплее, а ўтрам ідзём на зорке – солнышка ўсходзіць, самы холад, ідзём у школу*” (Верхнядзвінскі р-н)[17]; “*хадзілі ў школу, якіх чатыры кілометры, а не абуць нічаго, не адзець нічаго, а нада ў школу ісці ж*” (Ушацкі р-н)[18]. Складанае матэрыяльнае становішча і недахоп харчавання з’яўляліся асноўнымі прычынамі ненаведвання школы. Прычым выпадкі, калі дзеці не маглі пайсці ў школу па гаспадарча-матэрыяльнай прычыне, былі не адзінкавымі, што падцвярджаюць і архіўныя матэрыялы. Так, справаздачныя дакументы па Полацкай вобласці за 1946 г. сведчаць, што ў некаторых школах вобласці 2/3 вучняў прапускалі заняткі па гэтым прычынам [5, л. 144–118].

Вусны дыскурс разнастайны і шматпланавы. Безумоўна кожны ўспамін – гэта гісторыя канкрэтнага чалавека, які, знаходзячыся ў пэўнай жыццёвай сітуацыі, дзейнічаў тым ці іншым чынам. Аднак на ўласны жыццёвы досвед уплывала прыналежнасць да пэўнага сацыяльна-культурнага асяроддзя, эканамічнага ўкладу, у межах якога жыла адпаведная сям’я, што, у сваю чаргу, вызначала нейкі ўніверсальны алгарытм паводзінаў, выбар жыццёвых стратэгій, характэрных для вясковага соцыума ў цэлым. Успаміны рэспандэнтаў пра сваё дзяцінства – гэта адлюстраванне таго, як выбудоўваўся жыццёвы шлях непаўналетняга члена сям’і ва ўмовах пэўнай сістэмы каштоўнасцей, якую трансліравала сям’я рэспандэнта, і наколькі вызначальным для яго быў жыццёвы досвед бацькоў і сацыяльна-эканамічная рэчаіснасць. Палявыя матэрыялы сведчаць, што перш за ўсё гэта праяўлялася ў адносінах да адукацыі. Справа ў тым, што ў паваенныя гады адбывалася інтэнсіўнае ўключэнне дзяцей і падлеткаў у гаспадарчую вытворчасць вёскі, што было абумоўлена неспрыяльным эканамічным становішчам і спецыфічнай дэмаграфічнай сітуацыяй, бо наступствы Вялікай Айчыннай вайны былі катастрафічнымі для Беларусі. Роля і месца дзяцей у сістэме жыццезабеспячэння сялянскай сям’і, магчымасць вучыцца і распраджацца сваім вольным часам цалкам залежыла ад складу і эканамічнага дабрабыту сям’і. Пра гэта красамоўна сведчаць успаміны аднаго з рэспандэнтаў: “*Ну, тады ж цяжолыя пасляваенныя гады былі, бацька мой, яго ўбілі…,* ***гэта цяпер дзеці ў школу ходзюць, а мы ўжо кароў пасцілі****, гадоў у трынаццаць я ўжо ў калхоз пашла… Цяжка было, дужа цяжка”* (Міёрскі р-н)[19]. Спецыфіка дадзенага перыяду заключалася ў тым, што ва ўмовах моцнай паваеннай дыспрапорцыі полаўзроставай структуры, на плечы жанчын і падлеткаў лягло аднаўленне як уласнай, так і калгаснай гаспадарак. Асабліва часта гэты сюжэт гучыць ва ўспаінах, якія былі зафіксаваны ў найбольш пацярпелых раёнах: “*Жаншчыны былі, старыкі былі,..былі жаншчыны і то маладых жа не было, нікога маладых, старыкі*

[13] ЗА у 2021 г. ад ВФЮ (Ж), 1931 г.н., в. Барсукі Верхнядзвінскага р-на; файл № 2212.
[14] Там жа.
[15] ЗА в 2021 г. от НВМ (Ж), 1936 г.р., д. Поташня Миорского района; файл № 1615 на русском языке.
[16] ФА ПДУ: Зап. Лобач У., Корсак А., Сумко А. у 2020 г. БВІ (Ж), 1940 г.н., в. Зерчаніцы Ушацкага р-на.
[17] ЗА у 2021 г. ад ВФЮ (Ж), 1931 г.н., в. Барсукі Верхнядзвінскага р-на; файл № 2212.
[18] ФА ПДУ: Зап. Лобач У., Сумко А. у 2020 г. ад СВМ (Ж), 1933 г.н., в. Мажуйкі, Ушацкі р-н.
[19] ФА ПДУ: Зап. Аўсейчык У. у 2019 г. ад ГЛФ (Ж), 1940 г.н., у в. Цвеціна, Міёрскі р-н.

*толькі, а маладыя ўсе ў Германіі былі*" (Ушацкі р-н)[20]. Архіўныя дакументы падцвярджаюць скарачэнне долі працаздольнага насельніцтва і падкрэсліваюць, што асабліва зменшылася насельніцтва ў сельскай мясцовасці менавіта ва ўсходніх раёнах Полацкай вобласці – да 56,6% к даваеннаму ўзроўню, прычым колькасць працаздольных жанчын пераважала ў некалькі разоў (на 1 студзеня 1946 г. ва ўсходніх раёнах было 7179 працаздольных мужчын (па ўзросту) і 34 644 працаздольныя жанчыны) [5, л. 50]. Прычым падкрэслівалася, што падлік працаздольных адбываўся на падставе ўзросту і не ўлічваў інвалідаў ці жанчын з маленькімі дзецьмі, што аб'ектыўна яшчэ болей скарачала колькасць працоўных рук.

Матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць, што акрамя традыцыйнай дапамогі па хатняй гаспадарцы, звычайнай практыкай стала дапамога маці падчас яе працы ў калгасе, а таксама падмена маці на калгаснай працы, каб даць ёй магчымасць выканаць нейкія работы на ўласнай сядзібе [6]. "*Уже ходила в 4–5 класс, я ходила жать. Хадила с мамой жать, хадила помогала. Рожь жнёшь, вот этот ржевник. В 6 класс я ходила – косу в руки и кашу. Поточить косу ещё не умела*" (Міёрскі р-н)[21]. Неабходна адзначыць, што пасляваенныя падлеткі былі ўключаны і ў калгасную вытворчасць. Паўтараючымся сюжэтам з'яўляецца ўспаміны рэспандэнтаў пра тое, што пасля школы яны займаліся праполкай, зборам ураджаю на калгасных палях ці выконвалі іншыя работы. "*Я хадзіла ў чацверты клас. Канікулы – школу кончылі, сёння паследні дзень. Учыцельніца прыйшла і гаворыць: "прадседацель прыходзіў і сказаў, каб мы памагалі пасціць кароў". Вот так. Раз сказаў прадседацель калхоза, то…! Па чатары чалавекі як жывем, вот у шэсць устаём і ідзем пасціць і да вечара. Следующы раз другая кампанія – па вочарадi. І так усё лета*" (Верхнядзвінскі р-н)[22].

У неспрыяльных умовах падлеткі нярэдка станавіліся здабытчыкамі неабходных прадуктаў харчавання і рэсурсаў для аднаўлення сямейнай гаспадаркі. Узгадкі пра клопат дзяцей аб сваёй непрацаздольнай маці ва ўспамінах сустракаюцца досыць часта. "*Мама балела сільна. Ой, яе малярыя трасла і тады ангіна нейкая была, не дай Бог, гланды такія – гузы, а мы прыйдзем з сястрой, а тады пойдзем у лес, мы жылі каля лесу блізенька, дроў нацягаем ей…і апяць пашлі (жабраваць – аўт.). Так і выжылі*" (Расонскі р-н)[23]. Зыходзячы з уласнай жыццёвай сітуацыі, у першыя паваенныя гады некаторыя былі вымушаны той час, які адводзіўся на вучобу ці выкананне дамашняга задання, выкарыстоўваць зусім па-іншаму (пошукі рэсурсаў для сям'і, дапамога па хатняй гаспадарцы ці "заробкі") ці ўвогуле кінуць навучанне. У якасці прыклада можна прывесці ўрывак з успамінаў жанчыны, якая будучы дзіцёнкам з няпоўнай шматдзетнай сям'і (бацька загінуў на фронце – аўт.), на працягу некалькіх гадоў служыла ў заможнай сям'і, бо маці элементарна не магла забяспечыць нармальныя ўмовы жыцця: "*Бацька на вайне пагіб. У мамкі нас было шэсцера… тады мамка адвяла мяне пад Глубокае і некалькі гадоў я не прыхадзіла дамоў. Гусей пасціла ў хазяіна, а зімой пер'я скубала, у мяне кроў лілася з пальцаў ад пер'я. Мама прыязджала і ён даваў ячменя якога, жыта – 6 пудоў за мяне, а я жыла ў яго, ну мне добра было, мяне жалелі ўсе.* [А ці помніце колькі дзяцей было ў той сям'і?] *Тры дочкі і двое іх.* [А яны работалі?] *Не.* [А вы ў школу?] *А ў школу не хадзіла. Тут ужо дома нескалька начынала, але, як сказаць, ні аднаго класа…неграматная я. Яны ў школу хадзілі.*" (Ушацкі р-н)[24].

Шмат залежала і ад бацькоў, якія зыходзілі са свайго асабістага вопыту і лічылі, што школьная адукацыя – не самы важны кампанент у жыцці вясковага падлетка: "*Я один класс кончил, в колхозе работаю, заместителем председателя колхоза, и ты проживёшь*" (Глыбоцкі р-н)[25]. Такі падыход да адукацыі часцей сустракаецца ва ўспамінах з заходняга рэгіёну былой Полацкай вобласці. Неабходна адзначыць, што там у першыя паваенныя гады захоўвалася традыцыя "аддаваць у навуку" розным рамествам у мястэчка ці да майстра ў суседнюю вёску. З аднаго боку, гэта было характэрна для традыцыйнага погляду на навучанне дзяцей, бо меркавалася, што атрымаўшы пэўную "спецыяльнасць", будзе лягчэй пракарміць сям'ю, а з другога, – умовы паваенных гадоў унеслі пэўныя карэктывы. Перш за ўсё гэта закранула дзяўчат, якіх аддавалі вучыцца шыць. Бо ў першыя гады пасля вызвалення ад нацыстаў не хапала самага неабходнага, да і не было "вольных грошай", каб набыць гатовую рэч, а валоданне швейным рамяством прыносіла стабільны прыбытак у сям'ю: "*Партніха – гэта дужа зарабатачная была прафесія*" (Міёрскі р-н)[26]. Паказальным з'яўляецца ўспамін адной з рэспандэнтаў, якая скончыла толькі чатыры класы, а потым пайшла вучыцца да партніхі ў суседнюю вёску, бо, як яна сама тлумачыла, трэба было падымаць двух малодшых братоў: "*У Зябках была партніха. І тады папа прадаў пуню і купіў машынку.Усе грошы за пуню пайшлі на вучобу. Яна мне паказала як крой і шыць, і на машынке навучыла. Год я ў яе жыла. Да яе прыходзілі з налогаў, тады я хавалася пад ложак. Яна вучыла і абшывала*" (Глыбоцкі р-н)[27]. Гэты фрагмент, яскрава дэманструе адмысловую спецыфіку заходніх раёнаў у дачыненні да зместу і прызначэння адукацы ў жыцці непаўналетніх членаў сям'і.

Іншы раз на рашэнне кінуць школу накладаліся некалькі фактараў: нежаданне бацькоў і складанасці аб'ектыўнага характару. "*А колькі класаў скончылі? Чатыры з калідорам. Папа сказаў "хваціць, нада работаць – земля". Не, мы пусціліся хадіць у школу, там яшчэ адна дзевачка ці две. 9 кілометраў туды і адтуль, а ўжо восень…кінулі*" (Міёрскі р-н)[28].

---

[20] ФА ПДУ: Зап. Лобач У., Сумко А. у 2020 г. ад СВМ (Ж), 1933 г.н., в. Мажуйкі, Ушацкі р-н.

[21] ЗА в 2021 г. от НВМ (Ж), 1936 г.р. д. Поташня Миорского района; файл № 1615 на русском языке.

[22] ЗА у 2020 г. ад ЛЕП (Ж.), 1936 г.н., в. Асвея Верхнядзвінскага р-на; файл № 1402_01.

[23] ЗА у 2019 г. ад ВТІ (Ж), 1935 г.н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на; файл № 1903_19.

[24] ЗА у 2021 г. ад НІК (Ж), 1935 г.н. у Мар'янполле Ушацкага р-на; файл № 1407_21.

[25] ФА ПДУ: Зап. Лобач У., Сумко А. в 2019 г. от КНД (Ж), 1935 г.р. (родилась в д. Борейки), в д. Ломаши Глубокского р-на.

[26] ЗА у 2021 г. ад ІІ (Ж), 1936 г.н., в. Басяныя Міёрскага р-на; файл № 2906_21.

[27] ФА ПДУ: Зап. Сумко А.В. у 2018 г. ад ГФІ (Ж), 1940 г.н., в. Калечполле Глыбоцкага р-на.

[28] ЗА у 2021 г. ад НАД (Ж), 1928 г.р., в Узмёны Міерскага р-на; файл № 1456.

Не апошнюю ролю пры вырашэнні працягваць ці не вучобу, адыгрываў і той факт, што вайна прыпыніла працэс навучання, і за парты пасля вызвалення селі дзеці рознага ўзросту: “*Ну, у школу я і якая ўжо пашла, у школу, ужо знаеце, гэта мне было можа двенаццаць гадоў, дзесь ужо вайна кончылася, а там пака гэта школа арганізавалася*” (Глыбоцкі р-н)[29]. Гэта адбівалася і на дысцыпліне, і стварала пэўны дыскамфорт для вучняў і настаўнікаў: “*Там савсем хлопцы такія уззрослыя сіделі і не слушалі нічога. Ен сядіть і хахочыць. Па нямецкаму вучыцельніца плакала. Яна буквы нямецкія піша на доске, каб у цетрадку перапісвалі, а гэтыя хлопцы рысуюць карыкатуры какіе-та і хахочуць… Хуліганьё такое! Хадзілі пераросткі бальшыя, кавалеры, в пятам класе.*” (Верхнядзвінскі р-н)[30]. Адна з рэспандэнтаў падчас аповяду пра сваё пасляваеннае дзяцінства ўзгадала, што адной з прычын кінуць школу, акрамя цяжкага матэрыяльнага стану, было закранутае пачуццё ўласнай годнасці. Жыццёвыя перыпетыі заставілі бацькоў жанчыны пераехаць у Латвію, дзе яна вырашыла працягнуць навучанне, аднак прахадзіла ў школу толькі некалькі дзён: “*Прыехалі мы ў Латвію, 45 год я прапусціла, не вучылася, а 45/46 год учебный пайду ў школу ў Індру, 6 кіламетраў, пайду ў школу, мама гаворыць: “Ну, ідзі, калі хочаш”. Ну і пахадзіла там нескалька дней. Усё харашо, толькі я была пераросткам, там дзеці вучыліся нармальна і такія па свайму возрасту ў пятым класе, а я такая прыйшла ўжо дзяўчына 14 гадоў. І вот вучыцель мацемацікі, а там мацемаціка на рускім языке, а я прыйшла з беларускай школы. Ён мяне вызваў правіла па мацемаціке.. я правіла знала, расказала, а ён мне гаворыць “а чым яно характерно?”. А я не знаю, што атвеціць, я з беларускай школы, я такіх слоў не знаю, не знаю, што атвеціць, стаю як пень, а ён дзевачку другую, каторая пастаянна хадзіла ў школу па возрасту свайму, не пераростак, латышачка, яна атвеціла чым харакцерна гэта правіла, а мне сказаў: “садзісь, едініца”. І я больше ў школу не пайшла. Я чатыры класа закончыла, у мяне нікагда тройкі не было. Первы і втары клас ваабшчэ з пахвальнай граматай – гэта да вайны было. Хоць і цяжка было, ні вучэбнікаў, нічога не было, але старалася вучыцца харашо. Не пашла…за 5-6 кіламетраў буду хадіць, абуванне рваць і едініцы палучаць??? Ні пашла больше ў школу, пашла работаць к латышам*” (Верхнядзвінскі р-н)[31].

Палявыя матэрыялы сведчаць, што на фоне голада і холаду, рэспандэнты, чыё дзяцінства прыпала на ваенны і пасляваенны час, захавалі беражлівыя адносіны да рэчаў і прадуктаў харчавання на працягу ўсяго жыцця: “*Мы вайну прашлі, мы каждую трапачку берагли. Мама з пятага года, у неё было пальто, ана яго распарола, пашыла мне плацье, форма нужна была тагда, нужна была карычневая, а ў меня была чорная, і нада ж было с варатнічком. Ана пашыла, я хадзіла, плаціце берагла тры года: васьмой, дзевятый і дзесятый. І каждый раз ты прыйдзеш са школы, ты яго акуратненька паложыш, павешаеш дзе-та на стульчык, каб яно не памялася, толька ў школу, а дома, што прыдзёцца*” (Міёрскі р-н)[32]; “*Мы жили в офицерском доме…она стоит и чистит своему ребенку яблоко ножом и так толсто, мне кажется чистит. И это все срезает и выкидывает в ведро, а я стою (вот меня всю жизнь это так убивает…столько яблок в саду, а я не могу выбросить), стою и думаю, а попросить не могу: «Дай мне эти очистки – я съем*” (Полацкі р-н) [33].

Неабходна адзначыць, што вусны дыскурс складаецца з успамінаў рэспандэнтаў, якія адрозніваліся па свайму сацыяльнаму статусу і ўзроўню заможнасці. У адной і той жа вясковай грамадзе былі дзеці, якія па-рознаму перажывалі пэўныя аспекты свайго дзяцінства, што для адных было нормай, для іншых – нечым нязвыклым і нават прыцягальным. Гэта праяўлялася на ўсіх узроўнях паўсядзённасці. Вельмі яскрава пра гэта сведчаць палявыя матэрыялы: “[Ну і можна было жыць? Ці хватала?] *Як папа там работаў на дарогі, папа палучаў грошы і паёк дажа давалі. Я помню кансерву нейкую ў дзесяцілітровых банках і павідла какое-та, цяпер і нармальнае ніхто ня есці, а тады гэта ж было так важна, мама дасць тады каждаму па-трошку ўгасціць.* [Ну так не гаравалі пасля вайны?] *Мы – не. Вот там саседзі, я помню была саўсем малая, у нас было, было і масла, і хлеб і я на пасту сама не ганяла, но хадзіла к пастухам туды і выменяла адзін раз хлеб з маслам на піражок, з чым ён там быў, можа з лебядой ці з семям, дык я патом ў бальніцу папала*” (Глыбоцкі р-н)[34].

Аднак дзеці заставаліся дзецьмі і калі выдавалася вольная хвілінка, то яны забываліся на цяжар рэчаіснасці. З даўніх часоў гульні займалі важнае месца ў жыцці дзяцей, яны садзейнічалі правільнаму фізічнаму развіццю, развівалі спрыт, назіральнасць, кемлівасць, калектывізм і інш. Безумоўна гэтая тэма патрабуе асобнага даследавання, аднак можна акрэсліць асноўныя формы баўлення вольнага часу дзецьмі ў пасляваенны перыяд, зафіксаваныя ў матэрылах вуснай гісторыі. З большага гульні ў сваёй аснове заставаліся традыцыйнымі з адсутнасцю ці мінімальнай атрыбутыкай. Разам з тым неабходна адзначыць, што на формы баўленьня вольнага часу ўплывала месца лакацыі вясковай сям'і: хутар ці вёска. Палявыя матэрыялы сведчаць, што пераважалі актыўныя гульні з пошукам, палкамі, мячом ці яго займеннікамі. “[А вось у дзяцінстве гульні нейкія ж былі? У якія гульні гулялі?] *Ай, у* ***даўгі*** *ігралі. Значыць, адзін за другім бегаешь і лупішь. Там ешчо ў* ***свінню*** *гулялі.* [А это як?] *Свінню гулялі. Яка качолка камень і палкамі загонялі у яміну, як вот хакей, вот гулялі ў эта*” (Міёрскі р-н)[35]; “*О, якія гульні былі! Во дзе кладбішча не заросшае так было, збіраліся ўсе сюды, у блейкі гулялі.* [Гэта як?] *Во так во адвядуць круг і тут паложаць палку, а на гэту палку во так палку паложаць і ты стаіш, кійком гэтым дасі,*

[29] ФА ПДУ: Зап. Лобач У.А., Сумко А.В. у 2020 г. ад ШВА (Ж), 1935 г.н., в. Празарокі Глыбоцкага р-на.
[30] ЗА у 2021 г. ад ВФЮ (Ж), 1931 г.н., в. Барсукі Верхнядзвінскага р-на; файл № 2212.
[31] ЗА у 2021 г. ад ВФЮ (Ж), 1931 г.н., в. Барсукі Верхнядзвінскага р-на; файл № 2212.
[32] ФА ПДУ: Зап. Сумко А., Саланевіч А., Якубенак І. у 2019 г. ад ЯЛЯ (Ж), 1931 г.н. г. Дзісна.
[33] ЗА у 2013 г. ад ТЛШ (Ж), 1940 г.н., Полоцк.
[34] ФА ПДУ: Лобач У., Сумко А. у 2020 г. ад ТМА (Ж), 1939 г.н., в. Празарокі Глыбоцкага р-на.
[35] ФА ПДУ: Зап. Лобач У.А., Сумко А.В. у 2020 г. ад ВПШ (Ж), 1934 г.н., в. Парадні Мёрскага р-на.

*куды яна паляціць, калі далёка – гэта ты выйграў, а калі мала – прайграў, тады хто болей, дальше паляцела, гэты болей іграець, а тады ўжо з гульні выйшла. А яшчэ ў скокалку скакалі, у хаванкі гулялі*" (Ушацкі р-н)[36].

Згодна з успамінамі рэспандэнтаў самай распаўсюджанай дзіцячай забавай была гульня ў ***пікара***: "*Ну вот тут у полі, рабята сабіраліся ў пікара.*[Расскажыце, як у пікара гуляць? Ну вот сабраліся?] *Палкі, палка дліная.* [Недзе метр?] *Можа і болей, адзін стаіць там, а гэтат палку кароценькую, і ты должен збіць, а тады бегчы, і ен упорыць цябе палачкай, ну не балюча ж...*[А ці многа вас такіх было? Колькі вас малых пасля вайны?] *Ну рабят ж было раньше*" (Ушацкі р-н)[37]; "[А як гуляць у пікара?] *Ну вот "палачка-стукалачка на месце" крычалі. Мы праталіся ўсе, а адзін, каторы з гэтай палачкай, адбіваець "палачка-стукалачка на месте", а ўсе спрятаўшыся, тады бягуць хто каб успець адбіцца на гэтай палачке, каб ен не нашоў і не стаяць з гэтай палачкай і вот кажды стараўся прыбегчы і крыкнуць "палачка-стукалачка на месце". А еслі хто ня ўспеў, той станавіцца за гэтага з гэтай палачкай*" (Глыбоцкі р-н)[38].

Некаторыя рэспандэнты адзначалі, што ў дзяўчынак і хлопчыкаў былі свае гульні: "*Абычна ўсегда дзевачкі аддзяляліся, вот мы ў золата гуляем, мы – дзевачкі адны, мальчыкі – у іх другая ігра. Яны к нам не касаліся, у іх свае забавы, свае ігры, яны якія там рагаткі строілі, страляюць у вераб'ёў, свісткі разныя дзелаюць, а ў нас другое, у нас свае ігры.*"(Верхнядзвінскі р-н)[39]. Аднак у хаванкі гулялі ўсе, незалежна ад гендарнай прыналежнаці, ці, напрыклад, у ***"хапкі"***: "*У нас, прымерна вот, мы гулялі называлася "хапкі". Сабіралася десяць вот такіх камяшочкаў, мы іх аббівалі, ну, раньше місачкі і тарэлачкі былі гліняныя, і вот у каждага на десяць хапкоў. Збіраемся і пяць, шэсць чалавек, і начынаець хто-та іграць, і вот так падкідвае. Я дзяржу ў руке гэтыя десць хапкоў-камяшкоў і падкідваю, надо было кідаць і схваціць і еслі ты десяць штук схваціш...*" (Верхнядзвінскі р-н)[40]. У размовах пра гульні ў пасляваенны час сустракаецца і такая гульня, як "Пакойнік": "*Помню вот ляжаш на зямлі, а рэбяты астальныя ходзюць кругом і кажуць, там хто-та: "Марцін-пакойнік, памёр ва вторнік, сталі хараніць, а ён глядзіць." Ходзім адзін за адным, а гэты ляжыць мёртвы. "А як сталі хараніць, а ён глядзіць." А тады там далей: "А ён устаў." А ён устаець, ляціць ловіць каго-небудзь. Тады тот памрэць. Ну тады ўразбежку хто куды, ну тот каго паймаець – гэтат ужэ пакойнік, а эты ходзіць у кружок.*" (Міёрскі р-н)[41].

Пэўнае месца займалі імітацыйныя гульні, калі дзеці ўзнаўлялі самыя розныя жыццёвыя з'явы і стваралі мадэлі дарослага жыцця. Дзяўчаткі звычайна гулялі "ў дом", а хлопчыкі – "у вайну": "*В войну играли. Тут акопы были гатовые*" (Полацкі р-н)[42]. Аднак, неабходна адзначыць, што аднаўленне ваенных падзей у забаўляльнай форме больш часта фіксуецца ва ўспамінах рэспандэнтаў, якія нарадзіліся ў 1940-х – пачатку 1950-х гг. Што датычыць непасрэдна "дзяцей вайны", якія перажылі яе ўжо ў адносна свядомым узросце, то падчас інтэрв'ю гульню "у вайну" амаль не ўзгадвалі, бо казалі, што яны наваяваліся ў рэальным жыцці. Аднак ваенная тэматыка прысутнічала ў дзіцячых гульнях і звязана яна была, перш за ўсё, з кінутымі баяпрыпасамі і гэта датычылася, перадусім, хлопчыкаў. Забавы падобнага кшталту былі вельмі траўматычнымі і іншы раз сканчаліся трагічна. "*У нас жа мальчык застрэліўся. Пайшлі гуляць, у нас тут кусты такія былі небальшэнькія – фадэр называліся. Пайшлі яны. Не знаю якую яны ігрушку нашлі і яна ўзарвалася. Большага убіла, а меншы жыў. А тады радам у суседа, бабушка нашла на дарозе, гэта пасля вайны, як у фанрыку сцеклянку, ну і прынесла, пухлы такі, чыста белы. Ну і гулялі мальцы, і падкідвалі.... А дарослыя паехалі на поле. Папа мяне вядзець, толькі спусціліся ўніз, как драганець нешта. Папа бягом туды. Адзін ляжыць нежывы, а другой пасечаны. Сколька гадоў і стукалі, і бразгалі...помню толькі пахарон. Трох у нас.*" (Міёрскі р-н)[43]. Увогуле эксперыменты з баяпрыпасамі, якія засталіся з вайны, былі часткай дзіцячай рэчаіснасці на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў пасля сканчэння ВАВ. Пра гэта красамоўна ўзгадвае адзін з рэспандэнтаў: "*Бацька ў Барсуках кавырнуў каўшом і вырыў снарады, ну і я тут быў (мне было 9). Ну і ўсё! Механізм маментам закруціўся: адны палілі, другія снарад кралі, пака прыедуць гэты самыя. На веласіпед, ён не бальшы, саракапятка, наверна. Ну і прывязлі снарад у ельнік, а там ужо агонь гарэў – кастрышча было. Як кінулі туды, як вурзнуў, так Бэсэсэр дзе-та за ельнікам быў. Казаў, што «галоўка возле майго вуха праляцела». Вухнула, ну..мы тут і рассасаліся па вуглах. Ну, ты, знаеш, красіва взарвалась. Патом нас лавілі...Мы как-та жылі дружна, усё было разработана.*" (Верхнядзвінскі р-н)[44].

Калі аналізаваць палявыя фрагменты, звязаныя з баўленнем вольнага часу, то найбольш часта гэта тэма гучыць, калі размова ідзе пра зімовы перыяд, калі ў дзяцей з'яўлялася больш вольнага часу. Гэта і катанне на санках, самаробных каньках, і гульня "ў сняжкі". "*...за санямі былі падсанкі. Гэта калі строяцца, нада браўно везці. На санёх гэтых 2 – 1,5 м, а нада 4 м, тады ззаду прычэпліваліся падсанкі, і хвост балкі на іх браўся. Адчэплівалі падсанкі, а нагуляемся, заморымся, там і кідаем. А утрам палучым... Але нічога: узрослыя панімалі, што нам нада ў што-та занімацца. Мы так не сядзелі без работы: летам паслі кароў... Ні адной мінуты не было*

[36] ФА ПДУ: Зап. Лобач У.А., Сумко А.В. у 2020 г. ад ЖКС (Ж), 1931 г.н., в. Лажані Ушацкага р-на.

[37] ФА ПДУ: Зап. Лобач У., Корсак А., Сумко А. у 2020 г. ад НУЛ (М) , 1936 г.н., в. Двор (Зерчаніцы), Ушацкі р-н.

[38] ЗА у 2021 г. ад АФ (Ж) (нарадзілася в. Верхнія, Глыбоцкі р-н) 1929 г.н. файл № 1246.

[39] ЗА у 2021 г. ад ВФЮ (Ж), 1931 г.н., в. Барсукі Верхнядзвінскага р-на; файл № 2212.

[40] ЗА у 2021 г. ад ЮМА (Ж), 1930 г.н., в. Первамайскае Верхнядзвінскага р-на; файл № 1346.

[41] ЗА у 2021г. ад ВІР (Ж), 1931 г.н., в. Узмёны Міёрскага р-на; файл № 0920.

[42] ЗА у 2019 г. ад БМВ (М), 1942 г.н., в. Асёткі Полацкага р-на; файл № 1404_21.

[43] ЗА у 2021г. ад ІІ (Ж),1936 г.н., в. Басяныя Міёрскага р-на; файл № 2906_21.

[44] ЗА у 2020 г. ад СВФ (М), 1950 г. н., в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на; файл № 2205_20.

*ў нас свабоднай, штоб мы аддыхалі, паляжалі”* (Верхнядзвінскі р-н)[45]. Калі паблізу быў вадаём, то яго таксама прыстасоўвалі для зімовых забаў: “*Атока, зімой, што б замер, забіваецца кол, на яго адеваеш калясо, к этому калясу прывязваеш папярок жэрдіну, метраў пять, усе закрапляеш. Дальше, к гэтаму калясу прыкручваюцца ручкі. Ну і ўсе. Гэта калясо круціцца. На канец палкі цапляюцца санкі. Садзішся на санкі. І вот мы гэтай дружнай талпой і пашлі…раскручвае і патом палучаецца такая скорасць у гэтых санках – адзін ляжыць, а нас многа. Удержыцца значыць удержаўся, не – паляцеў*” (Верхнядзвінскі р-н)[46].

Асобным блокам ва ўспамінах пра пасляваеннае дзяцінства выступаюць сюжэты пра тое, як святкавалі традыцыйныя святы. Сустракаюцца аповяды пра ўдзел у калядным гурце ці прысутнасць на Жаніцьбе Цярэшкі, калі дзеці, якім узрост не дазваляў прымаць удзел у гульне,назіралі за працэсам, фіксуючы ў памяці цікавыя моманты: “*Свету ж не было, ні кірасіну, нічога. Пасадзют нас, ну малыя былі, пасадзют нас і гэтыя лучыны нарезаны з сасновых палак, і мы запалім. Значыць, тут міска стаіт з вадой, адгараіць (лучына) і валіцца, і тухнець тут. І дым жэ ідзець, і ўсё. А ў хаце там цёмна, а яны танцуюць – і мальцы, і дзяучаты. Ва ўсех гэта подошва дзерэвянная. Як стануць танцэваць, так як коні лятуць – так стукаюць. А мы свецім, у пальцы прыпячэць, дадзержыш гэту лучынку гарэць палец – прыпячэ, пусціш – яна ў ваду зваліцца, цёмна станець… а яны крычаць тут: “Маладзёж, цалуйтеся, цёмна! Цалуйцеся!” А мы сядзім на пліце*” (Міёрскі р-н)[47].

Што датычыла дзіцячых цацак, то большасць рэспандэнтаў казала пра адсутнасць як такавых. Гэта ў прынцыпе з’яўлялася ўласцівасцю вясковай культуры, дзе пераважалі саматробныя цацкі і назіралася іх нязначная колькасць. “*Ігрушак жа не было. З трапак рабілі. А калі іх там было дзелаць?! Бегалі на работу. З аіра дзелалі лялькі, косы заплятaлі. Рабяты як лучшых не відзелі, так і гэты былі ігрушкі. Усё сваё было, грошай не было*” (Верхнядзвінскі р-н)[48]. Сярод успамінаў можна знайсці фрагменты пра мячыкі, якія рабілі з шэрсціння хатняй жывёлы ці веташы: “*Мячыкі з кароўскай шэрсці, качалі, калі яна лінеяць, скатвалі такія небальшэнькія. Кідалі адзін аднаму і так кідалі*” (Міёрскі р-н) [49]; “[А мячик где брали?] *С тряпок, со всего, кто что придумывал*” (Полацкі р-н)[50]. Сустракаюцца сюжэты і пра лялькі, якія былі малападобныя на сучасныя: “*Платок скруціш, другі завяжыш – вот і кукла была*” (Міёрскі р-н)[51]; “*Куклы мы шылі з трапачак. Не было ніякіх ігрушак. Самадзельную кукалку малюсенькую пашыюць з трапачкі. Раз прыхажу дамой, а брат, малодшы і такі хуліганісты быў, прыхажу дамой, а ён маю куклу бальшым гваздём к падаконніку прыбіўшы за жывот. Скольківі слёз было*” (Верхнядзвінскі р-н)[52].

Разам з тым неабходна адзначыць, што ўзгадкі пра гульні і дзіцячыя забавы ў першыя паваенныя гады займаюць нязначнае месца ва ўспамінах, што было прадвызначана складанай эканамічнай сітуацыяй і цяжкім матэрыяльным становішчам. Дзеці і падлеткі разам з дарослымі выкарыстоўвалі ўсе магчымасці для паляпшэння дабрабыту сваёй сям’і, а на гульні не заставалася шмат часу.

**Заключэнне.** Такім чынам, успаміны рэспандэнтаў пра сваё дзяцінства – гэта адлюстраванне таго, як выбудоўваўся жыццёвы шлях непаўналетняга члена сям’і ва ўмовах пэўнай сістэмы каштоўнасцей, якую транслiравала сям’я рэспандэнта, і наколькі вызначальным для яго быў жыццёвы досвед бацькоў і сацыяльна-эканамічная рэчаіснасць. Палявыя матэрыялы сведчаць, што дзіцячая штодзённасць у паваенныя гады была скарэктавана неспрыяльным эканамічным становішчам і спецыфічнай дэмаграфічнай сітуацыяй, бо наступствы нацысцкай акупацыі і ваенных дзеянняў былі вельмі разбуральнымі для Беларусі. Роля і месца дзяцей у сістэме жыццезабеспячэння сялянскай сям’і, магчымасць вучыцца і распараджацца сваім вольным часам залежала ад складу і эканамічнага дабрабыту сям’і, а таксама ад сістэмы жыццёвых каштоўнасцей. Матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць, што існавала занальная спецыфіка рэгіёна, якая прадвызначыла пэўныя адрозненні ў дзіцячай паўсядзённасці Полаччыны. І тут уплывала не толькі лакацыя населенага пункта ў “зоне бедства” (найбольш пацярпелыя раёны) ці “зоне адноснай стабільнасці” (нязначная ступень разбурэння), але і прыналежнасць да розных мадэлей жыццезабеспячэння, падзел паміж якімі супаў з геаграфічным падзелам Полаччыны на ўсходнія (калектывізаваныя) раёны і, заходнія, дзе пераважаў аднаасобны сектар.

Так, калі казаць пра сферу адукацыі, то агульным ва ўспамінах з’яўляецца апісанне аб’ектыўных цяжкасцей (адсутнасць умоў і інструментаў навучання), з якімі сутыкаліся школьнікі. Аднак ва ўсходніх раёнах, дзе пасляваенная сітуацыя была найбольш драматычнай, часцей гучыць інфармацыя пра тое, што дзеці былі вымушаны прапускаць ці кідаць школу з-за складанага матэрыяльнага становішча сям’і і ісці працаваць, каб здабыць базавыя прадукты харчавання і неабходныя рэсурсы для сям’і, прычым самым запатрабаваным напрамкам для заробкаў былі менавіта заходнія, яшчэ не калектывізаваны, раёны. Полаччыны. Што датычыць наратываў з заходніх раёнаў, то матывацыя адмовіцца працягваць школьнае навучанне была некалькі іншая: неабходнасць працаваць ва ўласнай гаспадарцы разам з бацькамі ці, згодна з традыцыйнымі поглядам на адукацыю, перепрафіліравацца на атрыманне спецыяльнасці на даму, каб атрымліваць у будучым стабільны прыбытак. Што датычыць

[45] ФА ПДУ: Зап. студ. ПДУ Захарэвіч Ала і Жолудзева Паліна ў 2015 г. ад ММВ (Ж), 1927 г.н., нар. у в. Аляксееўцы, і КНІ (Ж), 1941 г.н., нар. у в. Страшныя (Новы Строй), у в. Дзёрнавічы Верхнядзвінскага р-на.

[46] ЗА у 2020 г. ад СВФ (М), 1950 г.н., в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на; файл № 2205_20.

[47] ФА ПДУ: Зап. Лобач У.А., Сумко А.В. у 2020 г. ад ВПШ (Ж), 1934 г.н. в. Парадні Мёрскага р-на.

[48] ФА ПДУ: Зап. студ. ПДУ Захарэвіч Ала і Жолудзева Паліна ў 2015 г. ад ММВ (Ж), 1927 г.н., нар. у в. Аляксееўцы, і КНІ (Ж), 1941 г.н., нар. у в. Страшныя (Новы Строй), у в. Дзёрнавічы Верхнядзвінскага р-на.

[49] ЗА у 2021 г. ад ІІ (Ж), 1936 г.н. в. Басяныя Міёрскага р-на; файл № 2906_21.

[50] ЗА у 2019 г. ад БМВ (М), 1942 г.н., в. Асёткі Полацкага р-на; файл № 1404_21.

[51] ЗА у 2021 г. ад ІІ (Ж), 1936 г.н. в. Басяныя Міёрскага р-на; файл № 2906_21.

[52] ЗА у 2021 г. ад ВФЮ (Ж), 1931 г.н., в. Барсукі Верхнядзвінскага р-на; файл № 2212.

баўлення вольнага часу, то гульні ў сваёй аснове заставаліся традыцыйнымі з адсутнасцю ці мінімальнай атрыбутыкай, але актуалізаваліся новыя, напрыклад, “у вайну”, што было абумоўлена асаблівасцю эпохі.

ЛІТАРАТУРА


1. Ракава, Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л.В. Ракава. – Мінск : Ураджай, 2000. – 111 с.
2. Гульні, забавы, ігрышчы / Склад. А.Ю. Лозка. – Мінск : Беларуская навука, 1996. – 534 с.
3. Николаева, И.В. Дети Витебщины в послеоккупационный период Великой Отечественной войны / И.В. Николаева // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XIX(66) Регион. науч.-практ. конференции преподавателей, науч. сотрудников и аспирантов, Витебск, 13-14 марта 2014 г. В 2 т. – Витебск : ВГУ им. П.М. Машерова, 2014. – Т. 1. – С. 341–342.
4. Николаева, И.В. Повседневность послеоккупационного периода Великой Отечественной войны: опыт различных социальных групп (на примере Витебской области) / И.В. Николаева // Витебский государственный университет имени П.М. Машерова. Ученые записки УО “ВГУ им. П. М. Машерова” : сб. науч. тр. – Витебск : ВГУ им. П.М. Машерова, 2014. – Т. 17. – С. 109–114.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 46. Спр. 148.
6. Сумко, А.В. Дзеці і падлеткі ў працоўнай дзейнасці беларускай паваеннай вёскі / А.В. Сумко // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки.– 2021. – № 9. – С. 121–124.


*Паступіў 06.01.2022*

## ПОСЛЕВОЕННОЕ ДЕТСТВО: ТРУД, ОБРАЗОВАНИЕ И СВОБОДНОЕ ВРЕМЯ (ПО МАТЕРИАЛАМ УСТНОЙ ИСТОРИИ ПОЛОТЧИНЫ)

***Е.В. СУМКО***

*Анализируются основыне сюжеты, раскрывающие особенности послевоенного детсва деревенских детей Северной Беларуси. В качестве источников исследования выступают собственные записи автора, а также материалы этнографических экспедиций Полоцкого государственного университета. Полевые исследования фиксируют, что роль и место детей в системе жизнеобеспечения сельской семьи, возможность учится и распоряжаться своим свободным временем целиком зависели от состава и экономического благополучия семьи, также от системы житейских ценностей, транслируемых семьёй респондента. Не последнюю роль отыгрывала зональная специфика региона (западный и восточный районы, которые представляли две модели системы жизнеобеспечения в послевоенный период), предопределившая некоторые отличия в детской повседневности Полотчины.*

***Ключевые словы:*** *послевоенное восстановление, деревня, система жизнеобеспечения, детство, труд, образование, школа, игра.*

## THE POST-WAR CHILDHOOD: WORK, EDUCATION AND LEISURE (BASED ON THE MATERIALS OF THE ORAL HISTORY OF POLOTSK DISTRICT)

***A. SUMKO***

*The article analyzes the main plots that reveal the peculiarity of the post-war childhood of the village children in Northern Belarus. The research sources are the author's own records and materials from the ethnographic expeditions of Polotsk State University. The field studies record that the role and place of children in the life support system of a peasant family, the ability to study and use their free time completely depended on the family composition and economic well-being, as well as on the system of life values of the respondent's family. The zonal specificity of the region (the western and eastern regions, representing two models of the life support system in the post-war period), which predetermined significant differences in children's everyday life in Polotsk region, played an important role.*

***Keywords:*** *post-war reconstruction, village, life support system, childhood, education, school, games, work.*